ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 18 (1016) ● ЧАЦВЕР, 31 мая 1973 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXXVIII

*17 ЧЭРВЕНЯ—ДЗЕНЬ ВЫБАРАЎ У МЯСЦОВЫЯ САВЕТЫ*

## ВАРТАЯ ВЫСОКАГА ДАВЕР'Я

— Добры дзень! Калі ласка, мне патрэбна...

Ідзе пералік кніг, без якіх студэнту не абысціся. І Лілія Паўлаўна добра гэта разумее. Таму так уважліва яна слухае кожнага, хто да яе звяртаецца. Стаіць кніга на бібліятэчнай паліцы—значыць, яна тут жа трапіць вам у рукі, няма — атрымаеце параду, дзе яе можна знайсці. І што вабіць наведвальнікаў бібліятэкі, мабыць, больш за ўсё, дык гэта ветлівасць, тактоўнасць, сапраўдная зацікаўленасць да патрэб чытачоў, гатоўнасць у той жа час прыйсці на дапамогу.

А калегі, з якімі Лілія Паўлаўна Міцкевіч працуе побач ужо многа год, адзначаюць нароўні з яе цудоўнымі душэўнымі якасцямі выдатнае веданне сваёй справы, арганізатарскія здольнасці, грамадскую актыўнасць.

І калі перадвыбарны сход калектыву бібліятэкі меркаваў, каго вылучыць кандыдатам у дэпутаты раённага Савета, прапанова дырэктара бібліятэкі І. У. Арэхоўскай аказаць давер'е Лілії Паўлаўне Міцкевіч была падтрымана аднадушна. Выступіўшыя на сходзе З. М. Шалупенка, Р. І. Ляховіч, А. М. Рукшын выказалі ўпэўненасць, што Лілія Паўлаўна Міцкевіч з гонарам апраўдае аказанае ёй давер'е.

**А. АЛЕНІЧ.**

# САРДЭЧНА ЗАПРАШАЕМ!

Дарагія сябры! Перад вамі шырока раскрывае дзверы адна са старэйшых навучальных устаноў рэспублікі — Беларускі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўны універсітэт імя У. І. Леніна.

Кожная вясна — хвалюючая і адказная пара для моладзі, выбіраючай свой жыццёвы шлях. Трэба вызначыць сваё прызванне, знайсці любімую справу, якой будзеш служыць, аддаючы ўсе сілы і веды. Маладому пакаленню — прадаўжаць будаваць камунізм і жыць пры камунізме. А для гэтага трэба добра валодаць спецыяльнасцю, быць шырока адукаваным чалавекам, актыўным грамадскім дзеячом.

Ва універсітэце створаны ўсе неабходныя ўмовы для даследчай работы ў галіне фізікі, хіміі, матэматыкі, біялогіі, грамадскіх і іншых навук.

У 1972-1973 навучальным годзе вучэбную і навуковую работу вядуць 93 кафедры, Навукова-даследчы інстытут прыкладных фізічных праблем, рад праблемных лабараторый, дзе працуюць 1.700 чалавек.

Вядомы ў рэспубліцы і за яе межамі універсітэцкія калектывы мастацкай самадзейнасці: народная харавая капэла, народны аркестр народных інструментаў, народны ансамбль танца «Крыжачок», студэнцкі тэатр, эстрадны ансамбль, духавы аркестр.

Універсітэцкая бібліятэка — буйнейшая вузаўская бібліятэка рэспублікі. У яе фондах больш мільёна тамоў падручнікаў, дапаможнікаў, даведнікаў, слоўнікаў, энцыклапедый, класічнай і арыгінальнай літаратуры, тысячы камплектаў перыядычных выданняў на розных мовах свету.

Багатыя і цікавыя па свайму зместу музеі універсітэта: гістарычны, геолага-мінералагічны, заалагічны.

Ва універсітэцкай аранжарэі сабраны прадстаўнікі флоры краін Еўропы, Азіі, Амерыкі, Афрыкі.

У распараджэнні студэнтаў цудоўныя вучэбныя карпусы, актавыя і чытальныя залы, клубы і ленінскія пакоі ў інтэрнатах, спартыўна-аздараўленчы лагер на возеры Нарач.

Ва універсітэце створаны ўсе ўмовы для таго, каб моладзь паспяхова авалодвала ведамі, фарміравалася палітычна сталай, ідэйна перакананай, фізічна моцнай і здаровай.

Шматграннае і цікавае жыццё шматтысячнага калектыву універсітэта шырока адлюстроўваецца ў насценных газетах вучэбных груп. курсаў, факультэтаў і ў шматтыражнай газеце БДУ.



## ФІЗІЧНЫ



*Багатае забеспячэнне лабараторый фізічнага факультэта навейшым абсталяваннем і прыборамі дазваляе праводзіць тут самыя разнастайныя эксперыменты.*

Фота **Д. Прэса.**

Тэхнічны прагрэс нашых дзён немагчымы без развіцця дакладных навук, у тым ліку і фізікі. Выкарыстанне фізічных метадаў і апаратуры ў розных галінах навукі, у тэхналагічных працэсах і аўтаматычных метадах кантролю з кожным днём павялічвае запатрабаванне на фізікаў самага рознага профілю з шырокім навуковым кругаглядам, добрай матэматычнай падрыхтоўкай, валодаючых арсеналам усіх сучасных метадаў даследавання. Маладых спецыялістаў, задавальняючых гэтыя патрабаванні, і рыхтуе фізічны факультэт.

Фізічны факультэт з'яўляецца адным са старэйшых ва універсітэце: ён быў створан на базе фізіка-матэматычнага аддзялення педагагічнага факультэта, адкрытага ў 1922 годзе.

Фізічны факультэт сённяшняга дня—гэта дзве з паловай тысячы студэнтаў, сярод якіх вучыцца каля ста пасланцоў зарубежных краін; 15 кафедр, на якіх працуюць каля двухсот выкладчыкаў, сярод якіх 11 дактароў навук і 70 кандыдатаў; каля ста чалавек, галоўным чынам выпускнікоў факультэта, вучацца ў аспірантуры і рыхтуюцца да выкладчыцкай работы ў вышэйшых навучальных установах. Пры факультэце створаны навуковыя лабараторыі, Інстытут прыкладных фізічных праблем. Працуе студэнцкая навукова-даследчая лабараторыя (СНДЛ) і студэнцкі вылічальны цэнтр (СВЦ). Вось чаму выбранне фізікі сваёй спецыяльнасцю адкрывае перад моладдзю неабмежаваныя магчымасці для творчай, захапляючай працы.

Падрыхтоўка спецыялістаў на факультэце вядзецца па дзвюх спецыяльнасцях: фізіцы, радыёфізіцы і электроніцы (дзённае і вячэрняе аддзяленні).

У адпаведнасці з запатрабаваннямі навукова-даследчых устаноў і народнай гаспадаркі рэспублікі па спецыяльнасці фізіка падрыхтоўка вядзецца па оптыцы і спектраскапіі, фізіцы цвёрдага цела, фізіцы паўправаднікоў, ядзернай фізіцы, ядзерных энергетычных устаноўках, біяфізіцы, цеплафізіцы, тэарэтычнай фізіцы, атамнай і малекулярнай фізіцы, квантавай электроніцы. Паступіўшыя на радыёфізічнае аддзяленне спецыялізуюцца па радыёфізіцы і электроніцы звышвысокіх частот, у тым ліку і па антэнных канструкцыях, па фізічнай электроніцы, па электрафізіцы, электронных матэматычных машынах і мікраэлектроніцы.

На працягу першых двух год студэнты вывучаюць агульную і тэарэтычную фізіку і вялікі цыкл матэматычных дысцыплін. Затым выбіраюць па жаданню адзін з пералічаных вышэй напрамкаў для далейшай спецыялізацыі. У распараджэнне студэнтаў прадастаўляюцца вучэбныя і навуковыя лабараторыі, забяспечаныя фізічным абсталяваннем. За год да заканчэння універсітэта, г. зн. у канцы IV курса робіцца размеркаванне на работу. Пасля гэтага студэнты праходзяць вытворчую практыку і выконваюць дыпломныя работы, тэматыка якіх цесна ўвязваецца з будучай практычнай дзейнасцю.

Выпускнікі факультэта—а іх толькі за пасляваенны перыяд падрыхтавана звыш 3.000—працуюць у самых розных галінах народнай гаспадаркі. Сярод іх член-карэспандэнт АН СССР, прэзідэнт АН БССР М. А. Барысевіч, дырэктар Навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем, Герой Сацыялістычнай Працы, акадэмік АН БССР А. Н. Сеўчанка, акадэмік АН БССР, лаўрэат рэспубліканскай прэміі 1972 года Ф. І. Фёдараў, члены-карэспандэнты АН БССР Л. В. Валадзько, Б. Б. Бойка, Г. П. Гурыновіч, А. М. Ганчарэнка, загадчыкі кафедр факультэта прафесары В. Д. Ткачоў, В. В. Ізох, С. С. Шушкевіч і многа іншых буйных вучоных, якія працуюць у розных напрамках сучаснай фізікі.

Пераважная большасць супрацоўнікаў навукова-даследчых устаноў рэспублікі фізічнага профілю—выпускнікі фізічнага факультэта.

Фізіка — навука пярэдняга краю, навука цяжкая і захапляючая. Для тых, хто не баіцца цяжкасцей, шырока адкрыты дзверы фізічнага факультэта.

**А. ЛАБУДА,**
**намеснік дэкана,**
**дацэнт.**

## ЮРЫДЫЧНЫ

Юрыдычны факультэт рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў-юрыстаў, якія накіроўваюцца на працу ў органы пракуратуры, суда, адвакатуры, Міністэрства унутраных спраў, выканкомаў мясцовых Саветаў дэпутатаў працоўных. Тэрмін навучання на стацыянары — 5 гадоў, на вячэрнім і завочным аддзяленнях — 6 гадоў. Студэнтам, якія закончылі курс навучання на юрыдычным факультэце, паспяхова здалі дзяржаўныя экзамены і абаранілі дыпломную работу, прысвойваецца кваліфікацыя «юрыст».

У перыяд навучання на факультэце студэнты вывучаюць марксісцка-ленінскую філасофію, палітычную эканомію, тэорыю навуковага камунізму, гісторыю КПСС, тэорыю і гісторыю дзяржавы і права, гісторыю палітычных вучэнняў, дзяржаўнае, адміністрацыйнае, фінансавае, грамадзянскае, крымінальнае права, грамадзянскі і крымінальны працэс, крыміналістыку, выпраўленча-працоўнае права, міжнароднае права і іншыя дысцыпліны. Акрамя таго, на факультэце чытаецца рад спецыяльных курсаў па праблемах дзяржавы і права.

Пачынаючы з трэцяга курса студэнты праходзяць адну з наступных спецыялізацый: дзяржаўна-прававую, судова-пракурорскаследчую, гаспадарча-прававую. На старэйшых курсах праводзіцца вучэбная і вытворчая практыка ў органах дзяржаўнай улады і кіравання, пракуратуры і суда.

Навуковае студэнцкае таварыства факультэта аб'ядноўвае каля 50 працэнтаў усіх студэнтаў, якія працуюць пад кіраўніцтвам прафесараў і дацэнтаў. У ліку навуковых работнікаў 11 дактароў і 39 кандыдатаў юрыдычных навук. Педагагічную і навуковую работу вядуць сем кафедр: тэорыі дзяржавы і права; гісторыі дзяржавы і права; дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва; грамадзянскага права; крымінальнага права; крымінальнага працэсу; крыміналістыкі.

На юрыдычным факультэце працуюць вядомыя вучоныя-юрысты: прафесары Ф. І. Гаўзе, І. І. Гарэлік, А. В. Дулаў, І. І. Марціновіч, І. С. Цішкевіч, В. Ф. Чыгір, Н. Г. Юркевіч і іншыя.

Тыя, хто заканчвае юрыдычны факультэт, атрымліваюць глыбокую тэарэтычную і прафесійную падрыхтоўку, якая дазваляе ім умела працаваць з людзьмі, быць актыўнымі праваднікамі палітыкі нашай Камуністычнай партыі.

**С. ДРАБЯЗКА,**
**в. а. дэкана факультэта, прафесар.**

# БІЯЛАГІЧНЫ

Вялікая ўвага, якая ўдзяляецца ў нашай краіне вышэйшай біялагічнай, медыцынскай і сельскагаспадарчай адукацыі, абумоўлена тым, што яна складае неад'емную частку багацця нашага грамадства, уяўляе сабой вялікую сацыяльную каштоўнасць, ад якой у немалой ступені залежыць здзяйсненне планаў эканамічнага і культурнага будаўніцтва.

У цяперашні час навука ў цэлым, і ў прыватнасці біялогія як тэарэтычная аснова медыцыны, сельскай, лясной і паляўнічай гаспадаркі і шэрагу іншых біялагічных вытворчасцей (антыбіётыкаў, біяпрэпаратаў, бактэрыяльных угнаенняў) стала непасрэднай вытворчай сілай. Перад біялогіяй стаіць таксама грандыёзная і вельмі актуальная задача: не толькі поўнасцю асвоіць біялагічныя рэсурсы наземнага і воднага жывёльнага і раслiннага свету нашай планеты, але і зберагчы яго.

Медыка-біялагічныя і сельскагаспадарчыя спецыяльнасці сталі цікавымі для моладзі. Біёлаг-генетык, біяхімік, біёлаг-фізіёлаг, урач-кардыёлаг, урач-неўрапатолаг, аграном-селекцыянер і шмат іншых спецыялізацый сярод медыка-біялагічных прафесій з'явіліся ў выніку бурнага развіцця сучасных прыродазнаўчых навук.

Атрымаць любімую спецыяльнасць — рэальная мара. Можна выбраць любую з тых дзесяці ВНУ нашай рэспублікі, на факультэтах якіх праводзіцца шырокая біялагічная падрыхтоўка. Сярод іх біялагічны факультэт БДУ з'яўляецца вядучым па падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў біёлагаў-біяхімікаў, мікрабіёлагаў, генетыкаў і цытолагаў, фізіёлагаў раслін, фізіёлагаў чалавека і жывёл, заолагаў пазваночных і беспазваночных жывёл, батанікаў. У сувязі з актуальнымі задачамі, якія вынікаюць з рашэнняў партыі і ўрада аб ахове прыроды ў СССР, на факультэце пачата падрыхтоўка спецыялістаў па ахове прыроды.

Навукова-педагагічныя кадры факультэта—гэта, у асноўным, былыя яго выпускнікі, якія маюць вучоныя званні і ступені прафесараў, дацэнтаў, дактароў і кандыдатаў навук. На васьмі кафедрах, якія кіруюць вучэбным працэсам, распрацоўваецца шэраг навуковых праблем гідрабіялогіі, мікрабіялогіі, біяхіміі, малекулярнай біялогіі, цытагенетыкі і іншых галін сучаснай біялогіі.

Пры факультэце працуе лабараторыя эксперыментальнай біялогіі, якая складаецца з сектара гідрабіялогіі і сектара малекулярнай генетыкі мікраарганізмаў, а таксама лабараторыя фотасінтэзу.

Вучэбную практыку студэнты-біёлагі праходзяць у вучэбных лабараторыях кафедр, у навукова-даследчых лабараторыях факультэта, у батанічным садзе універсітэта, заалагічным музеі, аранжарэі, вучэбна-доследнай гаспадарцы «Шчамысліца» і на біялагічнай станцыі возера Нарач.

Пасля агульнабіялагічнай, фізіка-матэматычнай і хімічнай падрыхтоўкі, пачынаючы з трэцяга курса, студэнты прыступаюць да спецыялізацыі па адной выбранай імі галіне біялогіі: на кафедрах яны слухаюць спецыяльныя лекцыйныя курсы, праходзяць спецпрактыкум, выконваюць курсавыя і дыпломныя работы. Студэнты шырока прыцягваюцца да навуковых даследаванняў па заданнях кафедр з тым, каб азнаёміць іх з элементамі і прынцыпамі навуковай творчасці, знайсці і выхаваць будучых навуковых работнікаў і вучоных. Пры кафедрах і лабараторыях рэгулярна працуе дзевяць студэнцкіх навукова-даследчых гурткоў. Члены студэнцкага навуковага таварыства актыўна ўдзельнічаюць у рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсах на лепшую студэнцкую работу. І, як правіла, работы іх атрымліваюць высокія ацэнкі. Асобныя даследаванні адзначаюцца прэміямі і медалямі. Многія студэнцкія работы публікуюцца ў навуковых часопісах.

Акрамя набыцця сучасных біялагічных ведаў, студэнты авалодваюць навыкамі арганізатарскай і грамадска-палітычнай работы. Для гэтага яны праходзяць грамадска-палітычную практыку, вучыцца весці агітацыйна-прапагандысцкую, культурна-асветніцкую, арганізатарскую і выхаваўчую работу ў калектыве.

Пачынаючы ад пасвячэння ў студэнты і да заканчэння вучобы студэнты ўдзельнічаюць у культурна-масавых, ваенна-патрыятычных, спартыўных мерапрыемствах, выступаюць з дакладамі перад рабочымі, калгаснікамі, у воінскіх часцях і школах. Яны арганізуюць сустрэчы з вядомымі дзеячамі навукі і мастацтва, ходзяць у турысцкія паходы па месцах працоўнай і баявой славы савецкага народа.

Спецыялістам, якія закончылі біялагічны факультэт, пасля абароны дыпломнай работы і здачы дзяржаўных экзаменаў прысвойваецца кваліфікацыя «біёлаг. выкладчык біялогіі і хіміі». Яны накіроўваюцца на працу ў навукова-даследчыя ўстановы, на некаторыя прамысловыя прадпрыемствы і ў школы.

Гонар факультэта—гэта больш дзвюх тысяч яго выпускнікоў, якія працуюць ва ўсіх кутках краіны ў сферы навукі, вытворчасці, народнай асветы.

**У. ШАЛАТОНІН,**
**намеснік дэкана, дацэнт.**





# ФІЛАЛАГІЧНЫ

Можна з поўнай адказнасцю сцвярджаць, што філфаку належыць рашаючая роля ў развіцці беларускай філалагічнай навукі. За гады свайго існавання ён падрыхтаваў тысячы высокакваліфікаваных спецыялістаў, многія з якіх сталі буйнейшымі вучонымі, пісьменнікамі, дзеячамі народнай адукацыі і беларускай нацыянальнай культуры. Для прыкладу зазначым, што толькі за пасляваенныя гады факультэт падрыхтаваў звыш чатырох тысяч спецыялістаў у галіне беларускай і рускай філалогіі, больш 100 дактароў і кандыдатаў філалагічных навук. Звыш 100 выпускнікоў факультэта сталі членамі Саюза пісьменнікаў БССР.

Цяпер на філалагічным факультэце (на ўсіх трох формах навучання — стацыянарнай, вячэрняй і завочнай) займаецца каля трох тысяч студэнтаў. На васьмі кафедрах факультэта працуюць вядомыя вучоныя-філолагі, сярод якіх 12 дактароў філалагічных навук, прафесараў.

Падрыхтоўка кадраў вядзецца па дзвюх спецыяльнасцях: беларускай мове і літаратуры, рускай мове і літаратуры. Паралельна з чытаннем лекцый па філалагічных, агульнаадукацыйных дысцыплінах з III курса ўводзяцца спецыяльныя заняткі з тым разлікам, каб праца студэнтаў у вызначаным напрамку заканчвалася напісаннем дыпломнай работы. Кіруюць такімі заняткамі, як правіла, вядучыя вучоныя прафесары М. Г. Булахаў, М. А. Жыдовіч, А. А. Лойка, М. Р. Ларчанка, І. Я. Навуменка, Л. І. Фіглоўская, А. Я. Супрун, Л. М. Шакун, П. П. Шуба; дацэнты І. А. Карабань, А. Ф. Манаенкава, Б. П. Міцкевіч, В. А. Захарава, Д. Я. Бугаёў і іншыя.

Філфак падтрымлівае цесныя сувязі з многімі універсітэтамі краіны — з Маскоўскім імя М. В. Ламаносава, з Ленінградскім імя А. А. Жданава, з Вільнюскім імя В. Капсукаса, а таксама з многімі вышэйшымі ўстановамі зарубежных краін — з Іенскім універсітэтам імя Ф. Шылера, Варшаўскім універсітэтам і Вышэйшай Кракаўскай педагагічнай школай (ПНР), з Сафійскім універсітэтам (Балгарыя), Люблянскім універсітэтам (Югаславія). Штогод студэнты-філолагі і навуковыя супрацоўнікі факультэта выязджаюць у названыя ўстановы, дзе ўдасканальваюць свае веды ў галіне нямецкай, польскай, балгарскай, славянскай і чэшскай філалогіі. У сваю чаргу філфак прымае студэнтаў і выкладчыкаў з ГДР, ПНР, Балгарыі, Югаславіі, Чэхаславакіі.

На факультэце паспяхова працуе творчае аб'яднанне маладых літаратараў «Узлёт», якім не першы год кіруе беларускі паэт, прафесар А. А. Лойка. Членамі аб'яднання выпушчана чатыры зборнікі. Да 50-годдзя БДУ супрацоўнікамі кафедры беларускай літаратуры, членамі навукова-даследчых гурткоў быў падрыхтаван і выдадзен зборнік «Універсітэт паэтычны», у якім прадстаўлены паэты ўсіх факультэтаў за ўсю універсітэцкую гісторыю.

**У. ЛАЗОЎСКІ,**
**намеснік дэкана, дацэнт.**

# ГІСТАРЫЧНЫ

Гістарычны факультэт складаецца з трох аддзяленняў — гістарычнага, філасофскага і палітычнай эканоміі.

На аддзяленні гісторыі па трох формах навучання (дзённай, вячэрняй і завочнай) вядзецца падрыхтоўка выкладчыкаў гісторыі і грамадазнаўства для сярэдніх агульнаадукацыйных школ і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, навуковых супрацоўнікаў архіваў, музеяў і навукова-даследчых інстытутаў.

Аддзяленне філасофіі рыхтуе выкладчыкаў філасофіі і грамадазнаўства сярэдніх навучальных устаноў і супрацоўнікаў сацыялагічных лабараторый і груп прамысловых прадпрыемстваў і ўстаноў. Падрыхтоўка кадраў на аддзяленні здзяйсняецца па дзённай, вячэрняй і завочнай формах навучання.

На аддзяленні палітэканоміі падрыхтоўка кадраў вядзецца толькі па дзённай форме навучання. Гэтае аддзяленне рыхтуе выкладчыкаў палітэканоміі і грамадазнаўства для сярэдніх навучальных устаноў, супрацоўнікаў навукова-даследчых устаноў і эканамістаў прамысловых прадпрыемстваў.

Студэнты аддзялення гісторыі спецыялізуюцца па гісторыі КПСС, гісторыі СССР, гісторыі БССР, новай і навейшай гісторыі, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў.

Найбольш падрыхтаваныя выпускнікі факультэта, якія на працягу ўсяго часу знаходжання ва універсітэце спалучалі паспяховую вучобу з грамадскай і навукова-даследчай работай, працягваюць вучобу ў аспірантуры, а пасля заканчэння яе працуюць у вышэйшых навучальных установах.

На факультэце вядуць вучэбную і навуковую работу кафедры гісторыі СССР, гісторыі БССР, новай і навейшай гісторыі, гісторыі старажытнага свету і сярэдніх вякоў, а таксама агульнауніверсітэцкія кафедры грамадскіх навук і замежных моў. На факультэце сфарміраваўся вялікі калектыў высокакваліфікаваных спецыялістаў.

Заняткі са студэнтамі вядуць такія вядомыя вучоныя, як члены-карэспандэнты Акадэміі педагагічных навук СССР прафесары Л. С. Абецэдарскі і С. А. Умрэйка, члены-карэспандэнты АН БССР прафесары І. М. Лушчыцкі, У. М. Сікорскі, прафесары Г. П. Давыдзюк, А. М. Кляўчэня, Г. М. Ліўшыц, Р. А. Левін, Ф. М. Нячай і іншыя.

Навыкі самастойнага навуковага даследавання студэнты набываюць у навукова-даследчых гуртках, якія працуюць пры кожнай кафедры. Тэматыка даследаванняў ахоплівае найбольш актуальныя і важныя праблемы гісторыі КПСС, айчыннай і зарубежнай гісторыі, марксісцка-ленінскай філасофіі і палітычнай эканоміі.

Вучоба на факультэце — гэта не толькі заняткі ў аўдыторыях. Археалагічная і вытворчая практыка, стажыроўка на прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах, у планавых установах, у архівах, музеях і навукова-даследчых інстытутах — важнейшыя элементы адукацыі будучых гісторыкаў, філосафаў і палітэканомаў.

Калектыў мастацкай самадзейнасці гістарычнага факультэта адзін з вядучых ва універсітэце. Студэнты прымаюць актыўны ўдзел у спартыўным жыцці БДУ. Факультэт з'яўляецца пераможцай агульнауніверсітэцкага агляду-конкурсу на лепшую пастаноўку спартыўна-масавай работы.

**І. ЦАРУК,**
**дэкан факультэта,**
**дацэнт.**

# МАТЭМАТЫЧНЫ

Матэматычны факультэт рыхтуе кваліфікаваныя кадры матэматыкаў. За гады вучобы студэнты не толькі атрымліваюць неабходны аб'ём творчых ведаў, але і набываюць навыкі самастойнай навукова-даследчай работы. Многія студэнты дасягаюць значных поспехаў. Вынікі іх даследаванняў публікуюцца ў перыядычных навуковых часопісах.

Выпускнікі факультэта накіроўваюцца пасля заканчэння вучобы на работу ў навукова-даследчыя ўстановы, канструктарскія бюро, заводскія лабараторыі, праектныя і планава-эканамічныя арганізацыі, у рабоце якіх шырока выкарыстоўваецца матэматычны апарат, у вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы. Студэнты, якія праяўляюць здольнасці ў навукова-даследчай рабоце, рэкамендуюцца ў аспірантуру. Толькі ў Інстытуце матэматыкі Акадэміі навук БССР працуе звыш 200 выпускнікоў матэматычнага факультэта. Нашы выпускнікі плённа працуюць і ў іншых інстытутах АН БССР (Інстытут тэхнічнай кібернетыкі, Інстытут ядзернай энергетыкі, Інстытут цепла- і масаабмену), у НДІ пры Дзяржплане БССР, на заводзе імя С. Арджанікідзе і іншых. Сярод выпускнікоў-матэматыкаў звыш 150 чалавек абаранілі дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук.

На факультэце працуюць вядомыя вучоныя акадэмікі АН БССР Ф. Д. Гахаў, У. П. Платонаў, Д. А. Супруненка, прафесары В. І. Вядзернікаў, І. А. Прусаў, А. Х. Турэцкі і каля 30 кандыдатаў фізіка-матэматычных навук.

Па колькасці студэнтаў матэматычны факультэт — адзін з буйнейшых факультэтаў універсітэта. На дзённай форме навучання займаецца каля 1.000 студэнтаў, на вячэрняй—звыш 300.

На факультэце ёсць шэсць кафедр: алгебры, матэматычнага аналізу, тэорыі функцый і функцыянальнага аналізу, тэарэтычнай механікі, агульнай матэматыкі.

Рад спецыяльных курсаў і семінараў забяспечваюць магчымасць паглыбленага вывучэння і затым самастойнай работы ў любым з напрамкаў матэматыкі.

Штогод група студэнтаў-матэматыкаў праходзіць вытворча-азнаямленчую практыку ў Іенскім універсітэце (ГДР).

Студэнтам, якія закончылі тэарэтычны курс, здалі дзяржаўныя экзамены і абаранілі дыпломную работу, прысвойваецца кваліфікацыя «матэматык». Студэнты, якія рыхтаваліся да педагагічнай дзейнасці, атрымліваюць дадатковую кваліфікацыю «выкладчык матэматыкі».

**І. ПАЎЛАЎ,**
**намеснік дэкана**
**факультэта, дацэнт.**



# ПРЫКЛАДНОЙ МАТЭМАТЫКІ

Факультэт прыкладной матэматыкі створан у 1970 годзе і прызначан для падрыхтоўкі спецыялістаў, здольных эфектыўна прымяняць матэматычныя метады і электронныя вылічальныя машыны (ЭВМ) для рашэння важных задач у навуцы, тэхніцы, народнай гаспадарцы, а таксама праводзіць даследаванні па стварэнню аўтаматызаваных сістэм кіравання (АСК) і іх комплексаў.

Прымяненне ЭВМ прывяло да паяўлення новага тыпу матэматыкаў (матэматыкаў-прыкладнікоў), якія, працуючы ў пэўных галінах навукі, тэхнікі, эканомікі, разам са спецыялістамі гэтых галін будуюць і аналізуюць матэматычныя мадэлі розных з'яў і працэсаў.

У цяперашні час на ФПМ займаецца больш 1000 студэнтаў, а ў будучым 1973-1974 навучальным годзе і[illegible]ане больш 1100.

Спецыяльнасць «прыкладная матэматыка» ўключае тры спецыялізацыі: прымяненне сродкаў вылічальнай тэхнікі для рашэння прыкладных задач; матэматычнае забеспячэнне ЭВМ; матэматычнае забеспячэнне АСК.

Студэнты факультэта атрымліваюць глыбокую агульнаматэматычную падрыхтоўку па ЭВМ і праграміраванню, метадах рашэння матэматычных задач, а таксама па раду іншых спецыяльных матэматычных дысцыплін. Яны праходзяць вялікую практыку ў вылічальным цэнтры (ВЦ) факультэта, які аснашчан ЭВМ тыпу «Мінск-22» і «Мінск-32», у ВЦ інстытута АН БССР і іншых устаноў.

Матэматыкі - прыкладнікі, добра знаёмыя з магчымасцямі ЭВМ і методыкай іх прымянення, вучацца самастойна распрацоўваць метады і алгарытмы лічбавага рашэння матэматычных задач, вытворчасці, распрацоўваць і ствараць матэматычнае забеспячэнне ЭВМ і АСК.

Вучэбную і навукова-даследчую работу са студэнтамі вядзе прафесарска-выкладчыцкі састаў сямі кафедр: вылічальнай матэматыкі, метадаў аптымальнага кіравання, матэматычнага забеспячэння ЭВМ, матэматычнага забеспячэння АСК, дыферэнцыяльных ураўненняў, матэматычнай фізікі, вышэйшай матэматыкі, а таксама супрацоўнікі ВЦ факультэта і дзвюх галіновых навукова-даследчых лабараторый.

На факультэце працуе 30 дактароў і кандыдатаў фізіка-матэматычных навук, прафесараў і дацэнтаў, у тым ліку аўтарытэтнейшыя вучоныя, вядомыя сваім вялікім укладам у навуку, шырокай грамадскай дзейнасцю.

На кафедрах факультэта распрацоўваюцца розныя навукова-даследчыя праблемы. Напрыклад, у галіне аптымізацыі дынамічных сістэм, апісваемых нелінейнымі сістэмамі дыферэнцыяльных ураўненняў, у галіне метадаў прыблізных вылічэнняў, аналітычнай, якаснай і асімптатычнай тэорыі дыферэнцыяльных ураўненняў, у галіне прымянення эканоміка-матэматычных метадаў і ЭВМ у планаванні і кіраванні вытворчасцю і інш. Кафедры, ВЦ і лабараторыі факультэта разам з тэарэтычнымі рашаюць і канкрэтныя задачы вытворчасці.

Да выканання многіх работ непасрэдна прыцягваюцца і студэнты.

Факультэт цесна звязан з многімі прадпрыемствамі і навукова-даследчымі установамі Мінска. Яны з'яўляюцца базамі вытворчай практыкі нашых студэнтаў. Як правіла, вынікі студэнцкіх дыпломных работ звязаны з рашэннем канкрэтных задач, адлюстроўваюць спецыфіку работы прадпрыемстваў і ўкараняюцца затым у вытворчасць. Большасць студэнтаў-выпускнікоў размяркоўваецца на тыя прадпрыемствы, у якіх выконвалася дыпломная работа.

Студэнцкія гурткі, спецкурсы і спецсемінары, работа на кафедрах і ў лабараторыях дазваляюць студэнтам факультэта акунуцца ў атмасферу навуковых пошукаў, дапамагаюць ім знайсці тое неабходнае накіраванне, якому яны затым прысвячаюць сваё жыццё пасля заканчэння універсітэта.

У гады вучобы студэнты прымаюць удзел у мастацкай самадзейнасці, у спартыўна-масавай і абароннай рабоце.

Тэрмін навучання на факультэце — 5 год. На першых двух курсах навучанне праводзіцца па адзінаму для ўсіх студэнтаў плану і адзіных праграмах. Тут асноўная ўвага ўдзяляецца агульнаматэматычнай падрыхтоўцы і праграміраванню. Пачынаючы з трэцяга курса студэнты выбіраюць сабе вузкую спецыялізацыю і кафедру. Тут побач з працягам агульнаматэматычнай падрыхтоўкі значнае месца адводзіцца спецыялізацыі.

Навучанне на факультэце заканчваецца абаронай дыпломных работ і здачай экзамена па марксісцка-ленінскай філасофіі.

Спецыялістам, якія закончылі факультэт, прысвойваецца кваліфікацыя «матэматык». Яны накіроўваюцца на работу ў навукова-даследчыя ўстановы, вылічальныя цэнтры і іншыя арганізацыі.

**Я. ІВАНОЎ,**
**дэкан факультэта, прафесар.**



*НА ЗДЫМКУ: студэнты III курса факультэта прыкладной матэматыкі на занятках па метадах вылічэння.*
*Фота Д. ЧАХОВІЧА.*



# ЖУРНАЛІСТЫКІ

Наш універсітэт першым у краіне пачаў падрыхтоўку журналісцкіх кадраў ва універсітэтах.

Стварэнне факультэта журналістыкі ў цяжкія гады Вялікай Айчыннай вайны (1944 г.) з'явілася доказам вялікай увагі і клопатаў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада аб уздыме культуры беларускага народа, аб яго высокай ідэйнасці, адданасці справе вялікага Леніна.

Для спецыяльнай падрыхтоўкі журналістаў была утворана кафедра тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку. У 1944 г. пачалі вучобу студэнты I—III курсаў. У большасці сваёй гэта былыя студэнты КІЖа. У 1946 годзе вучыліся ўжо 143 чалавекі.

Звыш 90 працэнтаў студэнтаў пасляваенных год складалі дэмабілізаваныя воіны, многія мелі вопыт газетнай работы. Першыя 11 журналістаў былі выпушчаны ў 1948 годзе. А за ўсе гады факультэт падрыхтаваў звыш 1600 журналістаў, якія працуюць амаль ва ўсіх шматтыражках, раённых, абласных і рэспубліканскіх газетах, на радыё і тэлебачанні і ў кніжных выдавецтвах.

З году ў год факультэт рос і расшыраўся. Да 1961 года на ім была толькі адна кафедра —тэорыі і практыкі партыйна-савецкага друку, якая вяла ўсе журналісцкія дысцыпліны. Цяпер працуюць чатыры кафедры: гісторыі журналістыкі, тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, тэорыі і практыкі радыё і тэлебачання, стылістыкі і літаратурнага рэдагавання. Стварэнне новых кафедр дазволіла палепшыць якасць падрыхтоўкі журналістаў і разгарнуць навукова-даследчую работу.

Вучэбны план разлічан на пяцігадовы тэрмін навучання. У ім прадугледжваецца значная колькасць гадзін на вывучэнне гісторыі КПСС, палітэканоміі, дыялектычнага і гістарычнага матэрыялізму, гісторыі філасофіі, гісторыі БССР.

Многа ўвагі ўдзяляецца моўным дысцыплінам. Студэнты вывучаюць сучасную рускую і беларускую мовы, рускі і беларускі фальклор, тэорыю літаратуры, гісторыю рускай і беларускай літаратур, гісторыю замежнай літаратуры, адну з замежных моў. Асаблівая ўвага аддаецца вывучэнню беларускай мовы, бо выпускнікі факультэта ідуць працаваць у рэдакцыі беларускіх газет, на радыё і тэлебачанне, перадачы якіх вядуцца на беларускай мове.

Усё навучанне падпарадкавана прафесійнай падрыхтоўцы будучых работнікаў друку, радыё- і тэлежурналістыкі. Шмат гадзін у плане адводзіцца тэорыі і практыцы партыйна-савецкага друку, стылістыцы і літаратурнаму рэдагаванню, спецкурсам і спецсемінарам. Студэнты вывучаюць таксама эканоміку прамысловасці і сельскай гаспадаркі, дэталёва знаёмяцца з публіцыстычнай дзейнасцю Маркса, Энгельса, Леніна, а таксама публіцыстаў ленінскай школы.

Студэнты-журналісты вывучаюць машынапіс і фотасправу.

Выкладчыцкую работу па прафіліруючых дысцыплінах вядуць высокакваліфікаваныя спецыялісты. Вучэбная і вытворчая практыка ў рэдакцыях газет, радыё і тэлебачання з'яўляецца неад'емнай часткай усяго навучальнага працэсу.

У падрыхтоўцы журналістаў вялікую ролю адыгрываюць студэнцкія навуковыя гурткі па гісторыі журналістыкі, публіцыстыцы ленінскай школы і сучаснай публіцыстыцы, якія аб'яднаны ў студэнцкае навуковае таварыства. Яно часта сумесна з дэканатам арганізуе сустрэчы з вядомымі публіцыстамі, работнікамі цэнтральных, рэспубліканскіх, абласных і раённых газет, радыё і тэлебачання. Акрамя гэтага, студэнцкае навуковае таварыства выпускае альманах «Творчасць журналіста», у якім друкуюцца навуковыя працы, мастацкія і публіцыстычныя творы студэнтаў у розных жанрах — апавяданні, фельетоны, фотарэпартажы, вершы, нарысы, гумарэскі і г. д.

**Р. БУЛАЦКІ,**
**дэкан факультэта, прафесар.**

# ГЕАГРАФІЧНЫ



Геаграфічны факультэт заснаван у 1934 годзе.

Сучасны навукова-тэхнічны прагрэс, бурнае развіццё народнай гаспадаркі, адукацыі і культуры краіны, расшырэнне сувязей з замежнымі краінамі ставяць новыя патрабаванні да падрыхтоўкі спецыялістаў-географаў. Географы ўсё шырэй і шырэй прымаюць удзел у рашэнні такіх народнагаспадарчых задач, як комплекснае выкарыстанне прыродных умоў і рэсурсаў, распрацоўка планаў і шляхоў пераўтварэння і аховы прыроды буйных рэгіёнаў, вывучэнне сучасных фізіка-геаграфічных працэсаў і іх прагназіраванне, рацыянальнае размяшчэнне вытворчых сіл, вывучэнне вытворча-тэрытарыяльных комплексаў, раённай планіроўкі, размяшчэнне і развіццё гарадоў і населеных пунктаў. Геаграфія вывучае і непаўторныя помнікі прыроды — запаведнікі і заказнікі, снежныя вяршыні і квітнеючыя даліны, бязводныя пустыні і суровыя ландшафты Поўначы.

Студэнты-географы атрымліваюць грунтоўную падрыхтоўку па марксісцка-ленінскай тэорыі. На працягу раду год студэнты вывучаюць сацыяльна-эканамічныя дысцыпліны (гісторыю КПСС, марксісцка-ленінскую філасофію, палітэканомію, навуковы камунізм). На сучасным этапе развіцця геаграфічных даследаванняў немагчыма без шырокага выкарыстання навейшых дасягненняў фізікі, матэматыкі, хіміі, праграміравання і прымянення матэматычных метадаў у геаграфічных даследаваннях. Таму студэнты - географы на першых двух курсах вывучаюць вышэйшую матэматыку, фізіку, хімію. Спецыяльная падрыхтоўка праводзіцца з першага курса. Студэнты вывучаюць шырокае кола геаграфічных дысцыплін: геадэзію, агульнае землязнаўства, геалогію, метэаралогію і кліматалогію, глебазнаўства і геаграфію глебы, агульную фізічную геаграфію, уводзіны ў эканамічную геаграфію. Спецыялізацыя студэнтаў пачынаецца з другога курса.

Геаграфічны факультэт рыхтуе географаў па дзвюх спецыяльнасцях: фізічная геаграфія і эканамічная геаграфія.



*У гэтым корпусе вучацца студэнты геаграфічнага факультэта.*

Фізіка-географы спецыялізуюцца ў галіне комплексных даследаванняў прыродных умоў розных раёнаў краіны для сельскагаспадарчых і прамысловых мэт. Пасля заканчэння універсітэта фізіка-географы накіроўваюцца на працу ў праектна-пошукавыя і здымачныя экспедыцыі розных ведамстваў, а таксама ў навуковыя ўстановы і выкладчыкамі геаграфіі ў сярэднія школы.

Спецыялізацыя па эканамічнай геаграфіі дае магчымасць ацаніць сучаснае гаспадарчае выкарыстанне прыродных рэсурсаў і ўмоў асобных раёнаў нашай краіны з мэтай высвятлення перспектыў развіцця і рацыянальнага размяшчэння гаспадаркі і насельніцтва.

Эканоміка - географы накіроўваюцца на працу ў праектныя і планавыя арганізацыі, навукова-даследчыя ўстановы і выкладчыкамі геаграфіі ў сярэднія школы.

У падрыхтоўцы спецыялістаў-географаў вялікая ўвага ўдзяляецца вучэбнай і вытворчай практыцы. Для выканання яе праграмы студэнты выязджаюць у розныя раёны рэспублікі і за яе межы (у Паволжа, Сібір, на Каўказ і Урал, у Карпаты, на Паўночны Захад РСФСР) у саставе экспедыцый і атрадаў, а таксама на экскурсіі пад кіраўніцтвам выкладчыкаў факультэта. Частка студэнтаў праходзіць практыку ў зарубежных краінах.

Побач з вучэбнай і вытворчай практыкай вялікая ўвага ўдзяляецца педагагічнай практыцы ў сярэдніх школах.

У саставе факультэта кафедры: эканамічнай геаграфіі СССР, эканамічнай геаграфіі зарубежных краін, фізічнай геаграфіі СССР і фізічнай геаграфіі зарубежных краін, агульнай геалогіі, глебазнаўства, геадэзіі і картаграфіі. Педагагічную работу вядуць высокакваліфікаваныя спецыялісты. Сярод іх 9 прафесараў, дактароў навук і 29 дацэнтаў і кандыдатаў навук.

На факультэце ёсць дзве навукова-даследчыя лабараторыі (меліярацыі ландшафтаў і азёразнаўства), вучэбная геаграфічная станцыя і вялікі геолага - мінералагічны музей, дзе экспануюцца мінералы і пароды Беларусі, Урала, Каўказа, Крыма і многіх іншых раёнаў Савецкага Саюза.

Пры ўсіх кафедрах працуюць навукова-даследчыя гурткі, дзе студэнты пад кіраўніцтвам прафесараў і дацэнтаў вядуць навуковыя даследаванні раду важных пытанняў эканамічнай і фізічнай геаграфіі.

Асобам, закончыўшым геаграфічны факультэт, прысвойваецца кваліфікацыя «географ-даследчык, выкладчык геаграфіі».

**М. РАМАНОЎСКІ,**
**дэкан факультэта, прафесар.**

# ПАДРЫХТОЎЧАЕ АДДЗЯЛЕННЕ

У 1969 годзе ў адпаведнасці з пастановай ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ва універсітэце адкрыта падрыхтоўчае аддзяленне з дзённай формай навучання, дзе на працягу васьмі месяцаў з адрывам ад вытворчасці перадавыя рабочыя і калгаснікі пад кіраўніцтвам вопытных выкладчыкаў рыхтуюцца да паступлення на фізічны, матэматычны, прыкладной матэматыкі, хімічны, біялагічны, гістарычны, юрыдычны, журналістыкі, геаграфічны, філалагічны факультэты.

На падрыхтоўчае аддзяленне прымаюцца асобы з закончанай сярэдняй адукацыяй з ліку перадавых рабочых, калгаснікаў і звольненых у запас з радоў Узброеных Сіл СССР па накіраваннях вытворчых прадпрыемстваў, будоўляў, арганізацый транспарту і сувязі, геолагаразведачных арганізацый, саўгасаў, калгасаў і камандавання воінскіх часцей.

Паступаючыя на падрыхтоўчае аддзяленне павінны мець бесперапынны стаж практычнай работы на працягу апошняга года на даным прадпрыемстве (у калгасе) у якасці рабочага або калгасніка. Адбор і накіраванне моладзі на падрыхтоўчае аддзяленне праводзіцца непасрэдна кіраўнікамі прадпрыемстваў, камандаваннем воінскіх часцей па рэкамендацыі партыйных, камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый. Накіраванні ад камандавання воінскіх часцей для звольненых у запас з радоў Узброеных Сіл СССР сапраўдныя на працягу года з моманту звальнення ў запас.

Слухачам падрыхтоўчага аддзялення выплачваецца стыпендыя і прадастаўляюцца месцы ў інтэрнатах у парадку, устаноўленым для студэнтаў першых курсаў.

Залічэнне на падрыхтоўчае аддзяленне праводзіцца па выніках субяседавання, якое праводзіцца камісіяй, назначанай рэктаратам універсітэта.

Слухачы падрыхтоўчага аддзялення пасля заканчэння навучання здаюць выпускныя экзамены па дысцыплінах, па якіх прадугледжана здача ўступных экзаменаў пры прыёме на адпаведныя факультэты універсітэта.

Асобы, якія паспяхова вытрымалі выпускныя экзамены, залічваюцца на першы курс дзённага аддзялення адпаведнай спецыяльнасці.

Прыём на падрыхтоўчае аддзяленне — з 1 кастрычніка 1973 года. Залічэнне — з 25 лістапада. Яўка на субяседаванне — па выкліку універсітэта. Пачатак заняткаў 1 снежня 1973 года.

Універсітэт чакае перадавых рабочых, калгаснікаў, дэмабілізаваных воінаў на падрыхтоўчае аддзяленне.

Сардэчна запрашаем!

**А. КАЖУШКОЎ,**
**загадчык падрыхтоўчага аддзялення.**

# ХІМІЧНЫ



Хімічны факультэт — адзіны ў рэспубліцы, дзе рыхтуюцца высокакваліфікаваныя кадры хімікаў для работы ў навукова-даследчых і заводскіх лабараторыях, у вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных установах і ў сярэдніх школах.

Адна з асаблівасцей вучобы на факультэце заключаецца ў тым, што вывучэнне ўсіх хімічных дысцыплін вядзецца на шырокай фізіка-матэматычнай аснове і галоўная ўвага ўдзяляецца тэарэтычным асновам хіміі, засваенне якіх немагчыма без глыбокіх ведаў адпаведных раздзелаў вышэйшай матэматыкі, квантавай механікі і фізікі.

Глыбокая тэарэтычная падрыхтоўка студэнтаў-хімікаў спалучаецца з эксперыментальнай работай у лабараторыях факультэта, дзе студэнты асвойваюць прыёмы і метады хімічнага эксперыменту і замацоўваюць тэарэтычныя веды.

У цяперашні час наша лабараторная база ўкамплектавана навейшым абсталяваннем. Маюцца інфрачырвоныя спектрографы, устаноўкі ядзернага і электроннага парамагнітнага рэзанансу, электронныя мікраскопы, электранографы, рэнтгенаўскія ўстаноўкі і іншае унікальнае абсталяванне, якое дазваляе вывучаць тонкія дэталі будовы і ўласцівасцей рэчыва.

На дзевяці кафедрах факультэта працуюць вядомыя ў рэспубліцы вучоныя-хімікі член-карэспандэнт АН БССР Р. Л. Старобінец, прафесары І. Р. Цішчанка, О. Р. Скараход, Д. М. Андрэеўскі і больш 70 кандыдатаў хімічных навук.

На старэйшых курсах у адпаведнасці з жаданнем і інтарэсамі студэнты спецыялізуюцца ў адной з больш вузкіх галін хіміі: неарганічнай, арганічнай, фізічнай, аналітычнай хіміі, хіміі паўправадніковых рэчываў, хіміі палімераў, хіміі нафты, радыё- і радыяцыйнай хіміі і будовы рэчыва.

Заканчваецца навучанне на факультэце абаронай дыпломнай работы, выкананню якой папярэднічае вытворчая практыка на перадавых хімічных прадпрыемствах рэспублікі або ў лабараторыях навукова-даследчых устаноў і педагагічная практыка ў сярэдніх школах.

У час вучобы студэнты маюць магчымасць непасрэдна ўдзельнічаць у навукова-даследчай рабоце, якая праводзіцца супрацоўнікамі кафедр. Гэта, бадай, адна з самых цікавых старонак студэнцкага жыцця, калі студэнт сам становіцца творцай навукі.

Роля хіміі ў народнай гаспадарцы і ў развіцці сучаснага грамадства агульнавядомая. Нам здаецца, што той, хто выбера сваёй спецыяльнасцю хімію, не пашкадуе аб гэтым.

**В. ЦІКАВЫ,**
**намеснік дэкана,**
**дацэнт.**



*У адной з лабараторый хімічнага факультэта.*

Фота **Д. Прэса.**



*Тысячы студэнтаў універсітэта ў вольны ад вучобы час гартуюць сваё здароўе, набіраюць сілу і спрыт у шматлікіх спартыўных секцыях.*

Фота **М. Хамца.**

# БЕЛАРУСКІ ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

## аб'яўляе прыём студэнтаў на 1973-1974 навучальны год

НА ДЗЕННАЕ НАВУЧАННЕ па спецыяльнасцях:

**беларуская і руская мова і літаратура, журналістыка, руская мова і літаратура, гісторыя, філасофія, правазнаўства, палітычная эканомія, хімія, матэматыка, прыкладная матэматыка, біялогія, геаграфія, фізіка, радыёфізіка і электроніка;**

НА ВЯЧЭРНЯЕ НАВУЧАННЕ па спецыяльнасцях: **беларуская і руская мова і літаратура, руская мова і літаратура, правазнаўства, гісторыя, журналістыка, філасофія, біялогія, хімія, геаграфія, фізіка, радыёфізіка і электроніка, матэматыка.**

Універсітэт рыхтуе высокакваліфікаваных спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі, навукі і культуры, выкладчыкаў вышэйшых, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і сярэдніх агульнаадукацыйных школ.

ПРЫЁМ ЗАЯЎ — з 20 чэрвеня па 31 ліпеня; уступныя экзамены — з 1 па 20 жніўня; залічэнне ў састаў студэнтаў — з 21 па 25 жніўня. Тэрмін навучання на дзённым аддзяленні 5 гадоў, на вячэрнім—6 гадоў.

Заявы аб прыёме падаюцца на імя рэктара універсітэта па адзінай форме (дадатак № 2 да правілаў прыёму ў ВНУ).

Да заявы прыкладаюцца: дакумент аб сярэдняй адукацыі (арыгінал), характарыстыка для паступлення ва універсітэт, медыцынская даведка (форма 286), чатыры фотакарткі (здымкі без галаўнога ўбору, 3×4 см).

Паступаючыя падаюць характарыстыку з апошняга месца работы, якая выдаецца партыйнымі, камсамольскімі, прафсаюзнымі і іншымі грамадскімі арганізацыямі, кіраўнікамі прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый, праўленнямі калгасаў, а выпускнікі агульнаадукацыйных школ—выдадзеную кіраўнікамі і грамадскімі арганізацыямі школ.

Характарыстыка ад камандавання воінскай часці звольненым у запас з радоў Савецкай Арміі не абавязкова.

Асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш чым два гады, а таксама накіраваныя на вучобу з адрывам ад вытворчасці або якія паступаюць на вячэрняе навучанне на спецыяльнасці, адпавядаючыя характару іх работы ў народнай гаспадарцы, разам з заявай павінны падаць завераную адміністрацыяй прадпрыемства або ўстановы выпіску з працоўнай або калгаснай кніжкі.

На навучанне з адрывам ад вытворчасці па спецыяльнасцях журналістыка, правазнаўства, філасофія, палітычная эканомія прымаюцца, як правіла, асобы, якія маюць стаж практычнай работы не менш чым два гады, пры гэтым на спецыяльнасць журналістыка прымаюцца асобы, што праявілі здольнасць да літаратурнай дзейнасці.

Пасля прыбыцця ва універсітэт паступаючы прад'яўляе асабіста пашпарт, ваенны білет (ваеннаабавязаныя запасу) або прыпіснае пасведчанне (асобы прызыўнога ўзросту).

Паступаючыя ва універсітэт на дзённае і вячэрняе навучанне здаюць экзамены ў залежнасці ад выбранай спецыяльнасці па наступных дысцыплінах: на спецыяльнасць **беларуская і руская мова і літаратура**—па беларускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна), гісторыі СССР (вусна); на спецыяльнасць **руская мова і літаратура**—па рускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна), замежнай мове (вусна), гісторыі СССР (вусна); на спецыяльнасці **журналістыка, гісторыя, філасофія, правазнаўства**—па рускай мове і літаратуры (пісьмова і вусна), гісторыі СССР (вусна), замежнай мове (вусна); на спецыяльнасці **фізіка, матэматыка, прыкладная матэматыка, радыёфізіка і электроніка** — па матэматыцы (пісьмова і вусна), фізіцы (вусна), рускай мове і літаратуры (пісьмова); на спецыяльнасць **хімія**—па хіміі (вусна), матэматыцы (вусна), фізіцы (вусна), рускай мове і літаратуры (пісьмова); на спецыяльнасць **біялогія**—па біялогіі (вусна), хіміі (вусна), матэматыцы (вусна), рускай мове і літаратуры (пісьмова); на спецыяльнасці **геаграфія і палітычная эканомія** — па матэматыцы (вусна), геаграфіі (вусна), гісторыі СССР (вусна), рускай мове і літаратуры (пісьмова).

Паступаючыя ва універсітэт на спецыяльнасці журналістыка, гісторыя, філасофія, правазнаўства, фізіка, матэматыка, прыкладная матэматыка, радыёфізіка і электроніка, хімія, біялогія, геаграфія, палітэканомія замест экзамена па рускай мове і літаратуры могуць здаваць экзамен па беларускай мове і літаратуры.

ЗАЎВАГА: узнагароджаныя пасля заканчэння сярэдняй школы залатым (сярэбраным) медалем або асобы, што закончылі сярэднюю спецыяльную навучальную ўстанову і сярэдняе прафесіянальна-тэхнічнае вучылішча з дыпломам з адзнакай, здаюць устаноўленыя экзамены толькі па адной з дысцыплін, а іменна: па спецыяльнасць беларуская і руская мова і літаратура—па беларускай мове і літаратуры (вусна); па спецыяльнасць руская мова і літаратура—па рускай мове і літаратуры (вусна); на спецыяльнасць журналістыка —па рускай мове і літаратуры або (па жаданню паступаючага) па беларускай мове і літаратуры (вусна); на спецыяльнасці матэматыка, прыкладная матэматыка—па матэматыцы (вусна); на спецыяльнасць хімія — па хіміі (вусна); на спецыяльнасць біялогія—па біялогіі (вусна); на спецыяльнасці фізіка, радыёфізіка і электроніка—па фізіцы (вусна); па спецыяльнасць геаграфія — па геаграфіі (вусна); на спецыяльнасці гісторыя, філасофія, правазнаўства — па гісторыі СССР (вусна); на спецыяльнасць палітычная эканомія—па матэматыцы (вусна).

Пры здачы экзаменаў па гэтых дысцыплінах з ацэнкай «выдатна» абітурыенты вызваляюцца ад далейшай здачы ўступных экзаменаў, а пры атрыманні ацэнкі «добра» або «здавальняюча» здаюць экзамены па ўсіх адпаведных дысцыплінах.

Яўка на ўступныя экзамены па выкліку прыёмнай камісіі.

Дакументы аб прыёме высылаць па адрасу:

220080 г. Мінск, 80, Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна. Прыёмнай камісіі (указаць спецыяльнасць).

**РЭКТАРАТ.**

**Наш адрас: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон —22-07-19.**
**АТ 07253** Заказ 664. **Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.**
**Рэдактар А. А. НІКОЛЕНКА.**